# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

19 снежня 2023 г. № 399 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту п а с т а н а ў л я ю:

1. За значны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2023 года:

Дваракову Міхаілу Іларыёнавічу, загадчыку кафедры веласіпеднага, канькабежнага і коннага спорту ўстановы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры“;

Каладзінскай Ванэсе Валер’еўне, інструктару па спорце вышэйшай кваліфікацыі спартыўнай каманды Міністэрства ўнутраных спраў, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па барацьбе вольнай дзяржаўнай установы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі ”Стайкі“;

Эйсмант Ганне Міхайлаўне, карэспандэнту спецыяльнаму першай кваліфікацыйнай катэгорыі аддзела спартыўных навін галоўнай дырэкцыі ”Агенцтва тэлевізійных навін“ Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

2. Міністэрству фінансаў у 2024 годзе выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2023 года з улікам памеру базавай велічыні на дату выплаты.

3. Не абкладаць падаходным падаткам з фізічных асоб сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2023 года, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з дадзеным Указам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

10